*Мелодыю мовы славянскай я чую.*
*Колас.*
*Купала.*
*У гэтых імёнах калыханку я чую,*
*Якую мне маці над светлай калыскай спявала.*
*Колас.*
*Купала.*
*Мелодыю мовы славянскай я чую,*
*Той мовы, якую агнямі палілі,*
*Ды з попелу Феніксам-птахам яна паўставала.*
*Колас.*
*Купала.*
*Падобны на шэпт збажыны*
*І плёскат азёрны імёны,*
*Якія паэтам сваім Беларусь даравала,*
*Колас, Купала*

*(У. Някляеў "Дарагія імёны")*

ДУА "СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА №1 Г.СЯННО ІМЯ З.І.АЗГУРА"



# Сцежкамі  Коласа І Купалы



Вязынка. Хата, дзе нарадзіўся Янка Купала




Вокладка першага зборніка вершаў Янкі Купалы «Жалейка» (1908 )



Помнік  Янку Купалу ў Вязынцы  (скульптар З.І.Азгур)

**“Творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа – гэта тыя вежы, з якіх мы, беларусы, бачым цэлы свет, і па якіх свет бачыць нас”**

**Віктар Шніп**

Янка Купала і Якуб Колас – гэтыя імёны ў нашым уяўленні заўсёды побач. Мы  гаворым: Янка Купала – і працягваем  Якуб Колас. І наадварот – Якуб Колас і Янка Купала. Такія своеасаблівыя “пары” – вядомая заканамернасць у сусветнай літаратуры, дзе ёсць Гётэ і Шылер у нямецкай, Пушкін і Гоголь у рускай, Бальзак і Стэндаль у французскай, Міцкевіч і Славацкі ў польскай літаратурах. Класік украінскай літаратуры Паўло Рыгоравіч Тычына нездарма параўноўваў Купалу і Коласа з дзвюма вяршынямі “беларускага Эльбруса паэзіі”.

Імкліва бягуць гады. Але колькі б часу ні прайшло, заўсёды будуць  жыць у памяці людзей Якуб Колас і Янка Купала  – выдатныя народныя паэты, без якіх немагчыма ўявіць сабе беларускую літаратуру. Яны пранеслі праз усё жыццё высокія ідэалы гуманізму, дабра і справядлівасці, аддаўшы народу свой талент, сваю душу і сэрца.  Іх словы  будуць гучаць вечна!

*Я адплаціў народу,*
*Чым моц мая магла:*
*Зваў з путаў на свабоду,*
*Зваў з цемры да святла*

*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою,-*
*Сотні новых і ясных дарог*
*Рассцілае жыццё прад табою!*



Якуб Колас з жонкай і сынам Данілам






У музеі Коласа (в.Мікалаеўшчына)